# Камісіі працавалі ў беспрэцэдэнтных умовах

**На пытанне аб чэргах, якія ўзніклі ўвечары 9 жніўня на некаторых выбарчых участках, старшыня ЦВК Лідзія ЯРМОШЫНА выказала ўпэўненасць, што чэргі ніяк не могуць паўплываць на з'яўленне ці адсутнасць сумненняў у адкрытасці і дэмакратычнасці выбараў.**

«Увогуле, па законе, участкі трэба было закрыць у восем гадзін вечара, але сыходзячы з таго натоўпу, які проста мог іх разграміць (што казаць, там шмат было агрэсіўных — гэта ўсё былі прыхільнікі альтэрнатыўных кандыдатаў, тыя, каго мы называем «электарат пратэсту»), уладамі Мінска, дарэчы, а абсалютна не Цэнтральнай камісіяй, было прынята рашэнне працягнуць (работу ўчасткаў. — **«Зв.»**), пакуль не прагаласуе кожны, хто стаіць у гэтай чарзе», — растлумачыла кіраўнік камісіі.

Пры жаданні працяг работы ўчасткаў можна расцаніць як парушэнне закона і адшукаць у сітуацыі падставу для падачы скаргі аб прызнанні выбараў несапраўднымі, прынамсі, на гэтых участках, пагадзілася спікер.

«Але тым не менш, яны ўсё ж такі на выніکі волевыяўлення не ўплываюць», — дадала кіраўнік ЦВК.

На яе думку, беспрэцэдэнтныя ўмовы, у якіх сёлета давялося працаваць выбарчым камісіям, падштурхоўваюць грамадства да пераходу ў будучым на электроннае галасаванне, каб пазбегнуць ціску.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# Міру і росквіту

## Замежныя лідары віншуюць Аляксандра Лукашэнку з перамогай на выбарах

**Першым накіраваў пасланне старшыня КНР Сі Цзіньпін, выказаўшы ўпэўненасць, што пад кіраўніцтвам Аляксандра Лукашэнкі Беларусь абавязкова дасягне новых бліскучых поспехаў у справе дзяржаўнага будаўніцтва. Кітайскі лідар адзначыў, што ў апошнія гады беларуска-кітайскія адносіны ўсебаковага стратэгічнага партнёрства функцыянуюць на высокім узроўні.**

«Кітай і Беларусь з'яўляюцца «жалезнымі братамі» і ўсебаковымі партнёрамі. Я надаю вялікае значэнне развіццю кітайска-беларускіх адносін і даражу добрымі рабочымі адносінамі і асабістым сяброўствам з вамі», — падкрэсліў Сі Цзіньпін.

Старшыня КНР выказаў гатоўнасць разам з кіраўніком беларускай дзяржавы прыкладаць намаганні для сумеснага прасоўвання кітайска-беларускіх адносін усебаковага стратэгічнага партнёрства, адкрыцця новых перспектыў узаемавыгаднага супрацоўніцтва ў розных галінах на карысць дзвюх краін і народаў.

Сі Цзіньпін пажадаў Аляксандру Лукашэнку моцнага здароўя і поспехаў у працы, сяброўскай Беларусі — росквіту і магутнасці, а яе народу — шчасця і дабрабыту.

Віншавальную тэлеграму накіраваў Аляксандру Лукашэнку і Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін.

«Разлічваю, што ваша дзяржаўная дзейнасць будзе садзейнічаць далейшаму развіццю ўзаемавыгадных расійска-беларускіх адносін ва ўсіх абласцях, паглыбленню супрацоўніцтва ў рамках Саюзнай дзяржавы, нарошчванню інтэграцыйных працэсаў па лініі Еўразійскага эканамічнага саюза і СНД, а таксама ваенна-палітычных сувязяў у Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. Гэта, несумненна, адпавядае карэнным інтарэсам братэрскіх народаў Расіі і Беларусі», — гаворыцца ў віншаванні кіраўніка Расіі.

З нагоды пераабрання на пасаду Прэзідэнта Аляксандру Лукашэнку тэлеграму накіраваў Прэзідэнт Казахстана Касым-Жамарт Такаеў, адзначыўшы: «Вынікі выбараў, якія адбыліся ў складанай палітычнай сітуацыі, сведчаць аб народнай падтрымцы вашага стратэгічнага курсу, накіраванага на ўмацаванне суверэнітэту і незалежнасці Беларусі».

Касым-Жамарт Такаеў выказаў упэўненасць, што ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва паміж Казахстанам і Беларуссю будзе і надалей паспяхова развівацца на карысць народаў дзвюх дзяржаў. Казахстанскі лідар пажадаў Прэзідэнту Беларусі поўнай рэалізацыі ўсіх намечаных планаў на пасадзе кіраўніка дзяржавы, а беларускаму народу — міру, стабільнасці, узаемаразумення і працвітання.

Па ініцыятыве азербайджанскага боку адбылася тэлефонная размова Аляксандра Лукашэнкі і Прэзідэнта Азербайджана Ільхама Аліева, які выказаў самыя шчырыя віншаванні і найлепшыя пажаданні ў сувязі з пераканаўчай перамогай Аляксандра Лукашэнкі на прэзідэнцкіх выбарах. Ільхам Аліеў падкрэсліў, што ў Азербайджане асабліва цэняць сяброўскія адносіны з кіраўніцтвам брацкай Беларусі.

У тэлефоннай размове павіншаваў беларускага Прэзідэнта і таджыкскі калега Эмамалі Рахмон. Прэзідэнт Таджыкістана адзначыў, што ён сам з самага ранку прымае шматлікія віншаванні з перамогай беларускага сябра на выбарах, а Беларусь і яе кіраўніка ад усёй душы віншуе таджыкскі народ. Эмамалі Рахмон перадаў Аляксандру Лукашэнку самыя цёплыя пажаданні і шчырыя словы падтрымкі.

Павіншаваў Аляксандра Лукашэнку Прэзідэнт Узбекістана Шаўкат Мірзіёеў, падкрэсліўшы: «Высокая яўка выбаршчыкаў і вынікі галасавання яшчэ раз прадэманстравалі велізарны давер беларускага народа да вас, яго з'яднанасць і поўную падтрымку працягу эфектыўных рэформаў, якія праводзяцца пад вашым кіраўніцтвам і накіраваны на павышэнне ўзроўню і якасці жыцця насельніцтва, забеспячэнне ўстойлівага эканамічнага росту ў краіне».

Віншаванні паступілі таксама ад Прэзідэнта Кыргызстана Сааранбая Жээнбекава, ад прэм'ер-міністра Арменіі Нікола Пашыняна і ад прэзідэнта Турцыі Рэджэпа Таіпа Эрдагана.

**Паводле БелТА.**



Фота БелТА.

**На думку назіральнікаў ад СНД, зафіксаваныя асобныя парушэнні на выбарах Прэзідэнта Беларусі не мелі сістэмнага масавага характару і не паўплывалі на вынікі выбараў, місія не адшукала фактаў, якія ставяць пад сумненне легітымнасць выбараў, сказаў кіраўнік Місіі, старшыня Выканаўчага камітэта — выканаўчы сакратар СНД Сяргей ЛЕБЕДЗЕЎ на прэс-канферэнцыі.**

Выбары: меркаванні назіральнікаў

# ЗАЎВАГІ НЕІСТОТНЫЯ

## Місія назіральнікаў ад СНД станоўча ацаніла арганізацыю выбарчага працэсу ў Беларусі

«Выбары 9 жніўня 2020 года праведзены ў адпаведнасці з Канстытуцыяй і Выбарчым кодэксам Беларусі. Яны былі адкрытыя, канкурэнтныя і забяспечылі свабоднае волевыяўленне грамадзян», — агучыў вывады місіі яе кіраўнік.

Сяргей Лебедзеў нагадаў, што місія назіральнікаў ад СНД працавала ў Беларусі з 24 ліпеня. У склад місіі ўвайшлі 184 прадстаўнікі васьмі дзяржаў Садружнасці. На прэс-канферэнцыі назіральнікі адзначылі добрую арганізацыю выбараў, годнае афармленне выбарчых участкаў і падрыхтоўку членаў выбарчых камісій усіх узроўняў.

«Радуе, што ўсе кандыдаты ў Прэзідэнты выступалі за мірнае правядзенне выбарчай кампаніі, недапушчэнне дзеянняў, якія ідуць супраць заканадаўства Беларусі, «майданаў» і гэтак далей. Настрой саміх кандыдатаў, якія яны выказвалі публічна, быў мірны, канструктыўны, нягледзячы на прыкметныя адрозненні ў іх праграмах, дакументах», — падкрэсліў кіраўнік місіі.

Місія дала агульную станоўчую ацэнку арганізацыі выбарчага працэсу, канстатаваўшы яго больш палітычны накал у адрозненне ад папярэдніх кампаній. Разам з тым, у праекце заявы зафіксавана, што агітацыя суправаджалася некарэктнымі, правакацыйнымі публікацыямі, якія садзейнічалі росту напружанасці ў грамадстве.

Назіральнікі ад СНД лічаць датэрміновае галасаванне зручнай для выбаршчыкаў формай правядзення выбараў, таму крытыку наконт яго назвалі беспадстаўнай. З нагоды іншых папрокаў Сяргей Лебедзеў адзначыў, што фотаздымка бюлетэняў не забаронена. Таксама кіраўнік місіі адзначыў, што гэту выбарчую кампанію істотна ўскладніла пандэмія каранавіруса, таму да абмежавальных мер назіральнікі ставіліся з разуменнем.

«Мы прыехалі сюды як сябры Беларусі. Мы вашы партнёры і па Садружнасці Незалежных Дзяржаў, і па іншых інтэграцыйных структурах. Мы разам вырашаем праблемы, якія ўзнікаюць перад нашымі краінамі, стараемся палепшыць жыццё нашых грамадзян», — рэзюмаваў Сяргей Лебедзеў.

**Генеральны сакратар Савета МПА СНД — кіраўнік Сакратарыята Савета МПА СНД Дзмітрый КАБІЦКІ** дадаў, што з участкаў, створаных за межамі Беларусі ў Баку, Ерэване, Кішынёве, Санкт-Пецярбургу і Маскве, дзе было арганізавана назіранне, не атрымана ніводнай скаргі ці сур'ёзных заўваг.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# «ПАСТАЎЛЕНАЯ ЗАДАЧА ПРАФЕСІЙНА ВЫКОНВАЕЦЦА»

## Назіральнікі на выбарах Прэзідэнта расказалі журналістам пра ўражанні і вынікі сваёй работы

**Аляксандр БАШКІН, назіральнік, намеснік старшыні Камітэта Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі па канстытуцыйным заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве** адзначыў тры фактары выбараў у Беларусі. Першы — пазітыўны, амаль святочны настрой выбаршчыкаў і выбарчых камісій, назіральнікаў.

«Другі фактар, вельмі важны, — адпаведнасць патрабаванням нацыянальнага выбарчага заканадаўства, так званым міжнародным выбарчым стандартам. Ні вялікіх, ні малых разыходжанняў з патрабаваннямі выбарчых стандартаў мы не сустрэлі», — сказаў назіральнік.

Трэці фактар, які выдзеліў Аляксандр Башкін — яўка. Ён адзначае вялікую актыўнасць грамадзян, асабліва ў першай палове дня.

«Тая колькасць выбаршчыкаў, якая наведала выбарчыя ўчасткі ўжо на гэты момант, сведчыць, што ўдзел беларусаў у сваіх выбарах актыўны», — сказаў Аляксандр Башкін.

Галоўнае патрабаванне, да якога, на яго думку, павінна імкнуцца і ўлада, і грамадства ў адносінах да выбараў, — зручнасць для выбаршчыкаў і празрыстасць. З гэтага, напрыклад, зыходзяць і ў Расіі, дзе плануюць праводзіць выбары ў некалькі дзён.

**Нурбек САТВАЛДЫЕЎ, назіральнік, намеснік генеральнага сакратара Савета Міжпарламенцкай Асамблеі СНД — паўнамоцны прадстаўнік парламента Жагарку Кенеша Кыргызскай Рэспублікі** расказаў, што ў такой якасці прыязджае ў Беларусь ужо другі раз — восенню быў на выбарах у Нацыянальны сход.

«Мне тады спадабалася. Сёння глядзім, назіраем. Па арганізацыі кампаніі я хацеў бы вельмі высокую ацэнку даць Цэнтральнай выбарчай камісіі, якая ў такім невялікім колькасным складзе арганізавала такія добрыя выбары і ў рэгіёнах, і ў сталіцы. Выдатная каманда. Пастаўленая задача прафесійна выконваецца», — сказаў назіральнік.

Нараканняў і заканадаўчых парушэнняў, па яго словах, няма. Нурбек Сатвалдыеў падзяліўся сваімі ўражаннямі ад краіны ўвогуле.

**Сяргей МІЦІН, назіральнік, першы намеснік старшыні Камітэта Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі па аграрна-харчовай палітыцы і прыродакарыстанні** канстатаваў, што на выбарах Прэзідэнта Беларусі створаны годныя ўмовы для галасавання.

Дэлегацыя міжнародных назіральнікаў наведала выбарчы ўчастак у Брэсцкім дзяржаўным музычным каледжы імя Рыгора Шырмы ў першыя хвіліны пасля яго адкрыцця.

«У нас даволі вялікая дэлегацыя ад Савета Федэрацыі. У Брэсце сёння наведаем восем участкаў. Мяркуючы па гэтым участку, арганізавана ўсё добра. Спадзяюся, што мы будзем сведкамі дэмакратычна праведзеных выбараў», — перадае словы Сяргея Міцін БелТА.

Сенатар дадаў: яму спадабалася, у адрозненні ад расійскіх выбарчых кампаній, што нідзе не валяюцца лістоўкі, усюды чысціня, парадак.